# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ФЕСТЫВАЛЬНАГА ТУРЫЗМУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

**М. А. Краўчанка**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П. В. Сухога», Рэспублика Беларусь*

Навуковы кіраўнік А. М. Карчэўская

Фестывальны турызм узнік параўнальна нядаўна і з'яўляецца надзвычай цікавым кірункам у турыстычным бізнэсе. Фестывалі прыцягваюць не толькі рэзідэнтаў, але і турыстаў, аказваючы ўплыў на сацыяльнае жыццё, культуру і структуру грамадства.

Мэта навуковай працы – распрацоўка прапаноў па развіццю фестывальнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна рашэнне наступных задач:

– правядзенне аналізу ўзроўню развіцця фестывальнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь;

– правядзенне маркетынгавых даследаванняў фестывальнага турызму.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь.

Прадметам даследавання з'яўляюцца тэндэнцыі развіцця фестывальнага турызму.

У дадзенай працы выкарыстана методыка сэрвіс-дызайну, а ў рамках гэтай методыкі – метад назірання.

Сэрвіс-дызайн – гэта набор тэхнік, дзякуючы якім можна прадказаць, якія ўражанні і які вопыт атрымае спажывец пры выбары і выкарыстанні канкрэтнай паслугі або тавару [1].

Выкарыстоўваючы метад назірання, пабудуем «карту падарожжаў» на прыкладзе фестывалю «Сожскі карагод». Будзем назіраць за спажыўцом і хутка рэагаваць пры ўзнікненні цяжкасцяў. На мал. 1 прадстаўлена «карта падарожжаў».




*Мал. 1*. «Карта падарожжаў» фестывальнага турызму

На першым этапе вызначаем нашу аўдыторыю. Мы назіраем за рэальнымі людзьмі, якія ўдзельнічалі ў фестывалі, каб зразумець якія пачуцці, эмоцыі, пытанні выяўляюцца на кожным этапе.

Быў падрыхтаваны пералік пытанняў для дадзенага даследавання:

1) адкуль спажывец пазнае аб правядзенні фестывалю?

2) дзе спажывец купляе квіткі?

3) як дабіраецца да фестывалю і дадому?

Такім чынам, спажывец, праходзячы па «карце падарожжаў», можа сутыкнуцца з рознымі ўражаннямі, як прыемнымі, так і менш прыемнымі.

Першае, з чым сутыкаецца спажывец, гэта інфармацыя, адкуль ён даведаецца аб дадзеным мерапрыемстве.

Другое – купля квіткоў можа адбывацца праз Інтэрнэт ці ж праз касу, да якой неабходна дабрацца альбо на асабістым аўтамабілі, альбо ж грамадскім транспартам.

Трэці этап – дарога да самога мерапрыемства. Цяжкасць можа паўстаць пры знаходжанні вольнага месца для асабістага аўтамабіля, што тым самым прадаставіць спажыўцу непрыемныя ўражанні. Для таго каб пазбегнуць падобнай сітуацыі, неабходна пытацца пры куплі квіткоў, на чым спажывец збіраецца дабірацца. Калі ж спажывец выбірае асабісты аўтамабіль, то неабходна ўказаць нумар месца для стаянкі. Прыбыццё да фестывалю можа ажыццяўляецца на грамадскім транспарце.

Чацвёрты этап – знаходжанне месца. Для праходу да свайго месца неабходна прайсці кантроль квіткоў. З-за вялікай колькасці людзей магчыма стварэнне чаргі, што можа прынесці спажыўцу непрыемныя ўражанні. Для таго каб пазбегнуць дадзенай сітуацыі, неабходна даць некалькі прахадных шляхоў. Да гэтага ж этапу адносіцца пошук туалета, які займае пэўную колькасць часу. Для хуткага пошуку можна намаляваць схему стадыёна на білеце. Звычайна ў жаночым туалеце вялікая чарга, што прыносіць спажыўцу непрыемныя ўражанні. Для пазбягання дадзенага інцыдэнту неабходна паставіць некалькі прыбіральняў.

Пяты этап – само сузіранне мерапрыемства. Ад месца на квітку залежыць бачнасць гэтага мерапрыемства. Калі спажывец сядзіць на бакавых сектарах ці ж сядзіць высока, яму будзе дрэнна відаць, тым самым ён атрымае непрыемныя ўражанні. У пазбяганне гэтага турысту можна даць бінокль. Дадзенае мерапрыемства

праходзіць на адкрытай тэрыторыі і на прыемнае баўленне часу могуць паўплываць ўмовы надвор'я. Такім чынам, сэрвіс павінен даць плед, падушку, парасон.

Апошні шосты этап – дарога дадому. З-за вялікай колькасці машын цяжка будзе выехаць, таму спатрэбіцца рэгуліроўшчык і прадастаўленне дадатковага грамадскага транспарту для меншага збору людзей.

Такім чынам, мы апісалі «карту падарожжаў», выявілі, на якіх этапах спажывец можа сутыкнуцца з непрыемнымі ўражаннямі, прапанавалі шляхі вырашэння праблем.

Вынікі аналізу дазваляюць нам арганізаваць канкурэнтаздольнае фестывальнае мерапрыемства.

Мы прапануем ажывіць паганскае свята багіні Макашы і зрабіць яго маштабным і цікавым, каб яно стала фэстам.

Нашы продкі былі язычнікамі, яны верылі ў сілу прыроды і жылі па славянскім календары. Для таго, каб акунуцца назад у мінулае, мы прапануем стварыць новы фестываль багіні Макашы. Гэты дзень заўсёды прыпадае на пятніцу ў канцы кастрычніка – пачатку лістапада.

Макаш – багіня зямлі і дажджу, ўраджаю, прадзення, ткацтва, заступніца рамёстваў, заступніца жанчын, багіня лёсу. Само імя «Макаш», або «Макош» звязваюць з некалькімі версіямі паходжання. Адной з версій, якой прытрымліваецца М. Фасмер, Макаш утварылася ад слова «мокнуць», і ў старажытнасці гэтая багіня напрамую была звязана з дажджом і ураджаем [2].

Макаш лічылася заступніцай жанчын і дзяўчат, з′яўлялася апякункай ўрадлівасці, жаночага рукадзелля, гаспадарлівасці і дастатку ў доме, шлюбу, ў родах. Акрамя таго, багіня Макаш тварыла вегетатыўную сілу раслін, давала пачатак жыцця травам і травой жа завяршала яе па сваім меркаванні. Здаўна народ пачытаў багіню Макаш падчас святаў ўраджаю. Вернымі слугамі Макашы з'яўляліся павукі, як лепшыя пральшчыкі. Таму лічылась добрай прыгметай, калі ў дзень памяці Макашы ў твар прыляціць павуцінне, яго нельга ірваць, а калі ў хаце ўбачыць павука, то гэта да поспеху, таму яго нельга забіваць [3].

Сімваламі багіні Макашы з'яўляюцца срэбра, месяцовы камень, горны крышталь, а таксама грэбень, пража, клубок воўны і верацяно. Жывёла Макашы – кошка, якая пільнуе сабраны ўраджай ад мышэй. Мабыць, таму рытуал захаваўся: ў новае жыллё неабходна першай пускаць кошку, каб у хаце жылося добра, а вось зламаць верацяно – дрэнны знак.

У рамках дадзенага фестывалю мы зможам вывучыць гісторыю нашых продкаў, іх абрады і рытуалы, тым самым зможам акунуцца ў сярэдзіну XIII стагоддзя.

Кожны жадаючы можа вырабіць абярэг, які дапаможа прыцягнуць поспех, паклікаць шчасце і прагнаць нягоды. Вырабляць яго неабходна ўласнаручна. Рабіць абярэг для іншага чалавека (нават для дзіцяці) нельга. Як жанчына, так і мужчына, павінны зрабіць яго самастойна, выкарыстоўваючы:

– цукар;

– старую чырвоную тканіну;

– высушаную галіну дрэва.

З тканіны варта зрабіць мяшочак. У садзе неабходна выбраць пладовае або дэкаратыўнае дрэва, якое прыцягвае Вас да сябе, ці падабаецца больш за іншых. Расліна абавязкова павінна быць жывой. На ёй трэба выбраць некалькі засохлых галінак. Варта выбіраць маленькія, паколькі непажадана іх ламаць, змяшчаючы ў мяшочак. Галінкі укладваюць у тканінавы мяшок, прысыпаюць цукрам і завязваюць.

У працэсе падрыхтоўкі абярэга варта славіць багіню Макаш і прасіць яе аб добрым лёсе, поспеху, багатым ураджаі. Затым мяшочак кладуць пад падушку на ноч. Абярэг у руках гаспадара зараджае сваёй сілай і станоўчай энергіяй [4].

Такім чынам, мы прапануем укараніць язычніцкі фестываль багіні Макашы, які прыцягне яе ўвагу і тым самым павысіць ураджайнасць на агародзе і прынясе ў сям'ю дабрабыт і багацце. А таксама можна будзе набыць абярэгі, якія ў гэты дзень яшчэ больш будуць аберагаць сям'ю і дом ад злосных вачэй.

Дадзенае свята можна зрабіць маштабным і цікавым, што дазволіла б прыцягнуць турыстаў.

Літаратура

1. Сервис-дизайн в маркетинге. – Режим доступа: https://ade.in.ua/servis-dizajn-v-marketinge/. – Дата доступа: 07.03.2019.
2. Макошь – богиня судьбы и женской магии. – Режим доступа: https://grimuar.ru/poltergeist/slavyanskie/makosh-boginya-slavyan.html. – Дата доступа: 07.03.2019.
3. День богини Макоши – повышаем урожайность по славянским традициям. – Режим доступа: https://vsadu.ru. – Дата доступа: 10.03.2019.
4. Когда праздник богини Макоши. – Режим доступа: http://slavyanskaya-kultura.ru. – Дата доступа: 10.03.2019.